# ПРЭЗІДЭНТ ПРЫНЯЎ ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА

**Як паведамілі БЕЛТА з прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 6 студзеня 1999 года А. Р. Лукашэнка прыняў са справаздачай прэм'ер-міністра С. С. Лінга.**

С. С. Лінг далажыў аб папярэдніх выніках развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі ў 1998 годзе. Разам са станоўчымі вынікамі па шэрагу паказчыкаў, адзначыў прэм'ер-міністр, у мінулым годзе не ўдалося забяспечыць выкананне заданняў прагнозу па асобных пазіцыях. У прыватнасці, гэта датычыць некаторых параметраў сельскагаспадарчай вытворчасці, стрымлівання інфляцыйных працэсаў, паказчыкаў знешнегандлёвага абароту.

Прэзідэнт даў указанні ўраду сканцэнтраваць дадатковыя намаганні на гэтых напрамках. Першачарговую ўвагу неабходна ўдзяліць арганізацыйным мерам па падрыхтоўцы да веснавой пасяўной кампаніі, забеспячэнню гаспадарак угнаеннямі, гаручазмазачнымі матэрыяламі. Трэба прадоўжыць сістэмную работу ў сферы павышэння ўрадлівасці глебы, эфектыўнага насенняводства, далейшага росту эфектыўнасці жывёлагадоўчых комплексаў. Сярод станоўчых вынікаў арганізатарскай работы па гэтаму блоку пытанняў было, у прыватнасці, адзначана тое, што ўдалося спыніць зніжэнне надояў малака.

Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць прыняцця актыўных мераў па стрымліванню цэн, развіццю экспарту.

Прэм'ер-міністр далажыў кіраўніку дзяржавы аб выкананні бюджэту на 1998 год. Было падкрэслена, што даходная частка бюджэту была выканана. У студзені за кошт атрыманых даходаў будуць закрыты ўсе запазычанасці мінулага года. Дэфіцыт бюджэту ў мінулым годзе склаў 1,5 працэнта супраць 2,5 працэнта, які прадугледжваўся ва ўказе прэзідэнта.

С. С. Лінг праінфармаваў аб выкананні даручэнняў і заўваг, зробленых прэзідэнтам у ходзе абмеркавання праекта бюджэту на 1999 год. Дапрацаваны праект будзе прадстаўлены кіраўніку дзяржавы 11 студзеня 1999 года.

Кіраўнік дзяржавы даў указанне ўраду прыняць неабходныя меры па забеспячэнню бесперабойнай работы нафтаперапрацоўчага комплексу. У сувязі з падрыхтоўкай да правядзення веснавой сяўбы асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць забеспячэнню гаручазмазачнымі матэрыяламі сельскагаспадарчай сферы.

**БЕЛТА.**